Teda Lee (Адэля Дубавец)



...я хацела мець побач моцных,
але ня меншых вар'ятаў
і гэткіх жа лёгкіх на пад'ём...

# Посьпех

***Аповед***

Вось так мы і ляжалі ў ложку, камечылі прасьціну і чыталі доўгія цягучыя паэмы пра караблі, няшчаднае каханьне і начныя пераўтварэньні. Ноччу мы і самі пераўтвараліся, мой чалавек хадзіў на прыстань і блытаў сеткі старым рыбакам, я забівалася рыбным брудам пад пазногці іх абветраным добрым жонкам і ўпляталася гаркаватым хатнім утулкам у сны іх даўно дарослых гарадскіх дзяцей, якія не зьяўляліся тут ні разу за зіму, каб раніцай яны ўставалі з раптоўным смуткам і выпівалі адным глытком шклянку фільтраванай вады, якая ўсё роўна аддавала хлоркай.

На касе вада пахне тухлымі яйкамі, што зробіш.

На зямлі – дэзінфекцыяй і чысьцінёй. На зямлі вада жыве ўнізе, глыбока пад заезджанымі аўтастрадамі, пад дзевяцьцю слаямі кватэраў, у якіх запякаецца лазанія са шпінатам для дарагіх гасьцей, у якіх васямнаццацігадовыя «заенькі» ванітуюць пасьля

пельменнай дыеты, у якіх кінутыя бальзакаўскія жонкі прымяраюць новыя спадніцы і скураныя боты на высокіх абцасах, а пасьля, шпурнуўшы боты ў кут, кідаюцца тварам на вышываныя падушкі і доўга трасуцца ўсім целам, у якім даўно не засталося сьлёз. На зямлі зашмат хлусьні, на касе хлусіць толькі мора і вечар, які сьцелецца жорсткай травой і мяккім туманам, які хвалюецца цяжкімі кірлямі і, здаецца, абяцае доўжыцца вечнасьць, а потым распушчаецца ў чорным-чорным, як кававая труха.

* * *

Вясной мяне выключылі з акадэміі. Я бадзялася па дзённым горадзе беспрытульнай савой, дазваляла сталейшым прыяцелям паіць мяне каньяком з трыма зорачкамі, падобнымі да сэрцайкаў, і падобнай да ласьціку ад памяці самбукай, вадзіць за руку, захвальваць мае песьні пра горад і смугу, запрашаць у свае душныя «жытлы», напальваць да таго стану, калі з вокнаў апошняга паверху ўзіраюцца жывыя рыбіны вочы з маленькай слановай костачкай і пыскай пад пахай. Я баялася трапляцца на вочы свайму бацьку, які быў суворым чалавекам і трымаў нас з мамай у вайсковай дысцыпліне, пакуль мы не паўцякалі кожная ў свой цёмны пакой: мама зьехала ў Стакгольм на нейкія няўцямныя семінары і ўжо год не вярталася, час ад часу дасылаючы смс-кі, у якіх былі адныя пытальнікі. Я наўмысна перастала наведваць акадэмію, куды мяне без майго ведама запхнулі бацькавы знаёмцы, бо ён наладзіў працу сківіцаў іх жонкам і каханкам.

Бацька быў добрым чалавекам. У яго было добрае чалавечнае імя Валодзя і прасторная кватэра ў цэнтры Менску, дзе на паліцах у цеснаце пацелі анатамічныя атласы, альбомы Босха, Клімта і Матыса, а ў цэнтры гасьцёўні зубаскаліў фосфарны чэрап з дзюравымі вачамі. Бацька любіў нагадваць мне пра тое, што прыехаў з лысенькага мястэчка, дзе не было аніводнай архітэктурнай адметнасьці, і дзе ён мог бы так і касіць траву да скону. На словах «касіць траву» я выбухала сьмяшком, а татаў голас узьвіваўся, як імклівая крывая на графіку і фальцэціў пра нястомную працу, посьпех і два аўтамабілі ў гаражы, фігня што адзін з іх быў дабітай іржавай аўдзюхай, а ў гаражы лютавалі пацукі, і залётныя матылі прэлі ў павуціньні, чакаючы прадказальнага лёсу.

Бацькаў посьпех быў мне абыякавы. Дакладней, я ня бачыла яго ў аскетычна няўтульнай кухні, у шпітальнай белі хатніх сьценаў, у камендацкай дзявятай гадзіне, якая была маёй дзіцячай рэчаіснасьцю і нянавісьцю. Я ня бачыла посьпеху ў люстраным бары, дзе тысячагоддзямі сумавалі джыны ў надораных пацыентамі пляшках з віскі і сапраўдным абсэнтам, ад якога да мяне заўжды прыходзіць даўгі Іван, кватарант маіх мрояў, бабруйскі жыдок з процьмай мудрасьці а'ля Рычард Бах. Я ня бачыла посьпеху ў летнім адпачынку ў Рыме, дзе мне не дазвалялася шкоднай пасты і сіцылійскай піцы, а вочы плылі гноем ад акліматызацыі. Я ня бачыла посьпеху ў халтурным паступленьні ў акадэмію, дзе цыклілі галаву, каб яна працавала бяз збояў і браку. Я – адмысловы брак майго бацькі, ягоны самы *непасьпяховы* праект.

* * *

Вясной пасьля выключэньня я сустрэла Паўліка. Гэта быў лысы гном

з дэкадэнцкімі настроямі, ён плакаў часьцей за дзяўчынак і рабіўся вельмі *прытарным* і непрыгожым ад сьлёз. Ён таксама выйшаў *сухім гусем* з бацькоўскага посьпеху і прывіду *шчасьлівай сям'ї*. Паўлік быў адзіным, хто не радаваўся вясьне і худзенькім зігзагам, якія засталіся ад сьнегу на асфальтаванай дарозе. Ён душыўся роспаччу і піў маю энергію засьмяглым ротам, дзеля гэтага ён знаходзіў мяне дзе-небудзь пасярод завулку Бранявога, куды я бегала штораніцы, каб стрэльнуць цыгарэту і паслухаць невясновае даўнтэмпа з маёй адзінай акадэмічнай сяброўкай Лідай, якая здымала падвальнае памяшканьне пад жытло і сушыла шкарпэткі і мой абсьлюняўлены шалік на трубах цеплатрасы. Такіх, як Паўлік, я заўжды прыцягвала ў сваё жыцьцё. Нягледзячы на Рычарда Баха, якога пад маркай аблегчанай версіі папулярнай філасофіі, а таксама найпрасьцейшага дапаможніка па ангельскай мове я чытала ў цьмяным даросьленьні, і які казаў, што «падобнае прыцягвае падобнае», мы з Паўлікам былі едныя, бадай што ўва ўсім, акрамя шляхоў дасягненьня сваіх мэтаў. Ох, тут я нахлусіла, насамрэч так: акрамя таго, што ў мяне гэтыя шляхі *былі*, а ў Паўліка, яны знаходзіліся на гіпатэтычным узроўні. У ім мне падабалася ўсё, апроч таго, што ён быў *галаслоўны*, як начная зязюля, якая начароўвае трыста чарапашых гадоў жыцьця з улікам запушчанага гаймарыту і гемарных нерваў у перыяд сесіі, і слабейшы за мяне роўна на такую ж лічбу. А я хацела мець побач моцных, але ня меншых вар'ятаў і гэткіх жа *лёгкіх на пад'ём*.

Лёгкай на пад'ём я была з таго самага моманту, як бацька перастаў быць моцным стрымвальным фактарам перад тым, як акунуцца ў небясьпечны змрок пасярод начы, прадрыжэўшы 5 секундаў у скрыпучым ліфце, які заўсёды можа спыніцца ўпарта і надоўга, і яшчэ 5 хвілінаў у прадчуваньні ранішняй *траўлі* па вяртаньні. Я не баялася сказаць «Хай!» начному прасьпекту і першаму лепшаму бумеру са стомленым тварам майго незнаёмага кіроўцы на адну ноч. Я прыходзіла ў чыесьці дамы з расстаўленымі па пакоях попелкамі і расьцярушаным попелам, каб праз гадзіну ляцець на сьпіне новага жалезнага каня, асла ці поні ў новыя чыесьці абдымкі, дзе мне ізноў было прахалодна, і я хуталася ў смутак, сыходзячы спаць у суседні пакой. А пасьля ізноў – здрасьця, мне трэба на Партызанскі прасьпект, на вуліцу Асаналіева, Байкальскую, Бангалор, Валгаградскую і далей у алфавітным папарадку, можна, я буду зрываць голас у адчыненае вакно, можна, я ня стану распавядаць вам усяго, а ўсё ж, можна, распавяду?

Я жыла вечнай дарогай, калі такім гучным словам можна назваць шэпт шынаў па гарадскіх вуліцах. Адзін раз, праўда, мы выехалі на кальцавую і нават гадзіну кружлялі па бессаромна чароўных лясных аўтамабільных сьцежках, але потым мне давялося гадзіну ляцець праз кусты і драпежныя сучкі, якія толькі і чакаюць вочнага яблыка, каб упіцца ў яго востранькім канцом, бо я саромелася сказаць, што ня маю чым расплаціцца за бясплённыя пошукі якогасьці лецішча. А чым маю – тым такія, як я, ня плоцяць. З тых часоў я перастала выпрабоўваць таксоўшчыкаў на моц іх ног, але працягвала гуляцца з імі ў межах гораду: лавіла іх, як рыбку ў французскай правінцыі, каб тут жа адпускаць, выклікала па чужым прозьвішчы, заражала інфекцыйнымі захворваньнямі, заморвала гучнай улюбёнай музыкай, раўла сьлязьмі дзіцяці, заплюхваючы вадкасьцямі сядушкі і панелі, якія пахнуць целамі і хімічным араматызата-

рам, ніяк не падобным да водару Атлантыкі ці лясных ягадак. І ўсё ж, трэба прызнацца: таксоўшчыкі – мае любімыя людзі.

Паўлік быў геніем. Ён пляваў на ўмоўнасьці так, як толькі геній можа на іх пляваць, ён апранаўся, як геній, хадзіў хадой генія, і няўклюдная хада генія заводзіла яго ў сумнеўныя тусоўкі дзікаватых мацяршчыньнікаў, якія марылі пра выратавальнае вінішча «Яблочный спас» і, узброіўшыся ўсемагчымым падлеткавым цынізмам, штурхалі цьвёрдым носам берца пустую бляшанку з-пад ліманаду і васпаваты твар маладога скіна ці гопніка, які адбіўся ад сваіх.

З Паўлікам мы сябравалі нядоўга. Хаця моцна і, здавалася б, на ўсё жыцьцё. Але аднойчы лішняя чарка ненаўмысна кульнулася і кульнула мяне ў ложак да Паўліка. У ложку было шмат перашкодаў: кнігі з жоўтымі лістамі і жоўтым восеньскім лісьцем між лістоў, ненавязьлівыя сьляды мінулых дзяўчынак, замаскаваная пад выглядам "балванак" музыка, крошкі торту, кроплі супу. І рудая балоневая куртка, якая служыла пледам, калі захочацца Хэмінгуэя і какавы, і намётам, калі раптоўна закарціць пагуляцца ў пасьцельны майданчык.

Ад Паўліка я ішла разгубленая і ліпкая. Мне хацелася найхутчэй занырнуць у гарачую ваду, у марскую соль, у пену для купаньня, якая абяцае правесьці араматэрапію і, зусім магчыма, падарыць бясплатны каментар псіхолага. Мне хацелася змыць з сябе гэты бруд і несправядлівасьць, памыць сябе да костак, высмактаць соль з кожнай поры, праць сябе, кіпяціць сябе, разьвешваць сябе на марозным гаўбцы, прасаваць сябе, вешаць сябе на плечыкі ў шафу-купэ з ліхтарыкам, як у лядоўні. Ня ведаю, колькі гадзінаў я адмывалася ад Паўліка, але калі зазваніў тэлефон і вывудзіў мяне з лазенкі, усё маё малочна-белае цела было пакрытае зморшчынкамі, якія бываюць на фалангах з боку далоняў, калі адмываеш тыднёвую калекцыю засаленых рондляў і індзюшатніцаў. Тым ня менш, стоячы на паркеце і пераступаючы з нагі на нагу, таму што з мяне сьцякала хлараваная вада, я адчувала сябе бруднай, паношанай жанчынай, якой засталося толькі каліва маладосьці, а далей будзе страх, сьмех, жудасны сьмех і страшна падумаць, што яшчэ.

– Я на лецішчы ў Будзькевіча, – у тэлефоне быў бацькаў голас. – Юра топіць лазьню. Прыязджай, яго жонцы няма з кімісьці.

«Лазьня!», – падумала я.

– Прыедзеш у лазьню? – спытаў бацька сувора і для пэўнасьці.

– З Блэк-Джэкам і шлюхамі? – завішчала я на манер робата Бэндэра.

Мой бацька ня любіць манераў робата Бэндэра, і ён тут жа паклаў слухаўку.

* * *

Лецішча дзядзькі Юры ніякае не багемнае месца. Вядома, на сьценах там сустракаюцца карціны, некаторыя нават падпісаныя золатам «Дарагому Юрыю», на асноўных сьценах вісяць здымкі фотамадэлек з васковымі ад непашкадаванага *фоташопу* тварамі, вядома, там ёсьць камін, вядома, высокі бетонны плот, вядома, суцэльны газон і ніякай макрыцы з палын-кустом, вядома, рыбны шашлык і ролы на вынас, а не падзертая морква са сьмятанай і гарбузовая каша з толькі што зрэзанай з грады

ягады. Вядома, там п'юць моцныя напоі доўгай сутарэннай вытрымкі. Вядома, вядома. Не, ні ў якім разе не парэчкавы морс і кампот з сушаных яблыкаў. Але вада там пахне крыніцай, земляной грушай і глыбіннымі чарвякамі. Вада там свавольная і непадробная, амаль як на касе.

Мяне ледзьве не «расчляніла» каўказская аўчарка названая, як асьліха, Долі, калі я вылезла з шэранькага «Пежо» і для стварэньня моманту нечаканасьці пералезла праз аўтаматычную браму. Я прыехала з чалавекам Арцёмам, пазітыўным, бяз кроплі вар'яцтва і д'яблаўскіх думак, *пасьпяховым* і закаханым у мяне з моманту нашага агульнага нараджэньня. Бацька *бачыў* нас разам, а мне хацелася ўбачыць бацьку задаволеным.

* * *

Вечарам газон распахся цэльнымі галандскімі пахамі, відаць, менавіта адтуль прыехала ў драўляным пакунку насеньне, падумалася мне. Палівачкі, якія ўвесь час неспакойна варочаліся, залівалі яго крынічнай вадой. Навошта, калі столькі вады было ад нядаўняга сьнегу, а потым з неба, праўдзівы патоп, падумалася мне ізноў. Я пайшла патаптаць гэтую грэшную зямлю, патапіць кеды ў вільгаці, каб яна ўсмакталася ў кедны брызент і папаўзла вышэй джынсамі. Арцём хадзіў за мной, тузаў і не на жарт палохаў цыстытам і бясплоддзем, менінгітам з-за мокрых пасьля лазьні і ўкручаных у ручнік валасоў, урэшце яму ўдалося зацягнуць мяне ў дом.

Жонка дзядзькі Юры была вельмі дагледжанай кабетай сярэдняга веку, якой ніколі ня ведаеш, колькі гадоў даць. Размаўляла яна з крыху утрыраваным маскоўскім акцэнтам, бо пражыла ў Маскве два гады, і акцэнт быў у яе *вывучаным*. Пасьля лазьні яна апранула белую шаўковую кашулю, стылізаваную пад гусарскія апраткі, і ўвабрала цёмна-зялёнае галіфэ ў вастраносыя каўбойскія боты. Пасьля яна села на верандзе і пачала піць каву, падліваючы туды каньяку з біклажкі. Гэта было сапраўднае кіно, дакладней, ролік прыгожага жыцьця, *красивой жизни*. Дзядзька Юра, наліўшы сабе і бацьку цягучай вадкасьці, заправіў антыкварны грамафон і паставіў кружэлку «Танцавальная музыка 30-х гадоў» з да болю анімэшнымі персанажамі на вокладцы. «Усё цыклічна», – падумала я. – «праз восемдзясят гадоў будуць ізноў маляваць дзевак з вялізнымі вачамі». Бацькава асістэнтка Наташа, прывезеная сюды *дзеля прыстойнасьці*, не знаходзіла сабе месца, яна хацела дапамагчы, але дапамагаць не было чаго, таму яна абышла ўвесь участак, так і ня збуўшы нябесна блакітных макасінаў з ружачкамі, і яны сталі шэрымі ды сапсаванымі на ўсё жыцьцё. Наколькі я здольная разумець Наташу, гэта хоць неяк дазваляла ёй адчуваць сваю жаноцкасьць і прыгажосьць. Яна вельмі хацела трымацца на вышыні і адпавядаць высокім патрабаваньням кампаніі. Што да мяне, то мне ня трэба было нічому адпавядаць, таму што я была ад нараджэньня *кім трэба*. Таму я цягала вялізны ручнік, які скруціўся матылёвай кукалкай над маёй патыліцай, і, забраўшыся на другі паверх, цалавалася з цыгарэтай, седзячы на стале з самотным кактусам ля сьцягна.

– Малышка, колькі ж ты будзеш паліць? – спытаў Арцём, прычыняю-

чы дзьверы за сабой, аднак, усё роўна пакідаючы шчылінку, каб бацька раптам не падумаў, што ён тут са мной *зачыняецца*.

– Не кажы мне пра шкоду для здароўя. Пакуль што я цалкам здаровая.

– Вось менавіта, пакуль што.

– Гэтыя палівачкі... калі яны так і будуць цурчэць усю ноч, раніцай мы прачнемся ў вадзе. А ў цябе валасы круцяцца ад вады. Прачнешся, кучаравы, як пудзель.

– Я прашу цябе, кідай паліць. І траву ў тым ліку. Яна адбівае ад рэальнасьці, а я так хачу, каб ты была шчасьлівая.

– Я і так шчасьлівая, Арцём, – сказала я з лагоднай усьмешкай.

У нас заўсёды такія размовы. Часам мне здаецца, што Арцём – самы бязрадасны чалавек на зямлі.

* * *

– За год ён адчыніў яшчэ тры новыя кропкі і студыю, – даносіўся зьнізу мужчынскі голас, казаў ці то дзядзька Юра, ці то тата (у Будзькевіча з маім бацькам галасы вельмі падобныя, а Арцём пішчыць і гундосіць, як падлетак), – у іх нейкія падвязкі ў падатковай, там цёмнымі атрымліваецца ўтрая больш, і кліент пастаянны, бо – прэстыж.

– Так, гэта посьпех, несумненна. *Посьпех*.

* * *

Раніцой мне давялося пасябраваць з Долі. Дзеля гэтага я сьцягнула вялікі кавалак учарашняга шашлыку, які не давалі сабакам з-за магчымых збояў страваваньня (жонка дзядзькі Юры называла сабак “нашыя дзеткі”, па-мойму, тут клініка бясспрэчна), за гэта аўчарка ласкава дазволіла мне перелезьці праз плот і распусьціцца ў сьвітанку, пакуль усе астатнія апроч нас з вялізарнай сучкай яшчэ толькі пераходзілі да адгляду другога сну.

Я не хацела, каб мой фотаздымак на пашпарт з перакошанымі плячыма паказвалі па БТ, а тата заклейваў цнатлівыя шпалеры маімі ню-фотасесіямі, зьнятымі ў ясельныя васьмідзясятыя на «Зеніт», у якім заядаў барабанчык. Я не хацела, каб мной апекаваўся росшук Інтэрполу, а пенсійная акторка серыялаў Зінаіда, якой бацька выправіў прыкус, прычасала сваім языком усю кінастудыю і паўгораду, распавядаючы пра тое, як ад Валодзі паразьбягалася ўся сям’я. Я ведала, што бацька справіцца і без мяне, завядзе сабе каня ў Ратамцы, як завёў Наташу для гасьцей і загараднага адпачынку. Таму я пакінула цыдулку, у якой коратка і радасна, цалкам у фармаце мадэратара ФМ-радыё, распавяла пра тое, што зьязджаю жыць да мамы. Я нават прыпісала асобную ўдзячнасьць Арцёму і паставіла малюсенькае сардэчка, каб ён усьцешыўся тым, што мы ізноў усіх «надурылі» і тэатральна пасумаваў з выглядам «маладога чалавека сапраўднай бестыі». Ён заўсёды атрымліваў асалоду ад такога.

На трасе, з якой выходзіла вада, крыху затрымлівалася каля каленяў і ляцела парам угору, я злавіла фургон фабрыкі «Слодыч», у якім ехалі скрынкі, начыненыя сьмятанкавым печывам з разынкамі, ненаркатыч-

ным макам, вочкамі і рожкамі шакаладных чалавечкаў, ванільнымі нябёсамі і какававымі дзядамі. Чалавек за стырном быў вельмі падобны да Кулінковіча: той жа прыгожы чэрап з шышкамі, тыя ж лупатыя вочы, як і ў мяне. Я заўсёды хацела, каб Саша быў маім гуру, месіяй у няслушным, заганным і выблюдачным жыцьці. Я гэткі ж выблюдак, як ён, гэткі ж чужы, надзелены незвычайнай мудрасьцю кайфовы выблюдак. Зрэшты, ня ведаю, хто навучыў мяне прыпісвацца да анёлаў няўмелым крыжыкам у канцы сьпісу.

Чалавек за стырном увесь час маўчаў, ён паліў пры зачыненых вокнах і слухаў нейкі незнаёмы мне пост-панк.

– А што гэта грае? – запыталася я.

– Адна маладая менская каманда.

– Дык а як яны называюцца? – спыталася я, вытрымаўшы паўзу дзеля прыстойнасьці.

– У іх пакуль няма назвы. Яны ні разу не выступалі, – сказаў чалавек і зірнуў на мяне. Такім позіркам, ад якога перамкнула дыханьне.

Я заткнулася і нечакана адчула сябе зусім маленькай, ручкі зноў сталі пухленькімі, з немаўлячымі складачкамі, а валасы зноў ператварыліся ў пух з малочна-саламянымі пахамі, з вачэй зьнік увесь нажыты боль, расчараваньне і досьвед, у адну руку ўрасла савецкая гумавая цацка з вялізнымі сьмярдзючымі вушамі, у іншую – пластыкавы кубачак з гусьценькай сумесьсю на смак крэм-бруле. Вось такая я і застыла, наіўная, шчанючая, пылянячая, укленчыўшы на месе, бо забалелі ножкі, калі мой кіроўца спыніў фургон, дастаў тэрмас з чаем «Ліптан», *які выбраў нас*, распакаваў печыва з арэшкамі і пачаў падкормліваць мяне, адводзячы погляд ад маіх дзіцячых позіркаў проста ў вочы, ад маіх бестурботных усьмешак і дачэрняй мімікі.

– Ты такая маладзенькая і бадзяешся па дарогах, – сказаў кіроўца, пазіраючы ўбок.

– Я не бадзяюся, я еду ў Вільню, – паправіла я ціха.

– Гэта такі змрок: бегчы кудысьці ўжо ў дзяцінстве. Так можна ўсё жыцьцё пражыць у дарозе, – прамовіў чалавек, быццам і ня чуў майго апраўданьня.

Мы стаялі на ўзбочыне, міма нас сьвісталі кулямі выпадковыя аўтамашыны, а зусім побач, унізе, у канаве стыгла вада.

– Так шмат азёраў гэтай вясной, – сказала я, макаючы шакаладнае печыўка ў гарбату. – Вада паўсюль назьбіралася, гэтыя канавы, доўгія калюгі – паўсюдна ў лясах і палях. З вадамеркамі, вадарэзамі, вадалазамі. Мікракосмас.

– А што ты хацела пасьля такіх сьнягоў. Пруха, жыцьцё прэ і ня спыніш. Я за ноч трох зайцоў ледзь ня зьбіў. Дурныя зусім. А на гэтых паглядзі, – кіўнуў ён на лабавое шкло, па якім было размазана з дзясятак буйных інсэктаў, – труперню тут мне ўчынілі. І ў большасьці жыцьцё – дзень. А мы гадамі ня можам знайсьці сэнсу, і потым скардзімся, што жыцьцё кароткае.

– Ну, мы чакаем чагосьці. Чакаем, што вось адбудзецца жаданае, вымучанае, а потым разумеем, што гэта чаканьне і было жыцьцём.

– А ты ўжо навучылася жыць, а не чакаць жыцьця? – спытаў кіроўца

з ледзьве заўважнай усьмешкай. Напэўна, усьміхаліся толькі вочы, ці, да прыкладу, толькі нос.

– Я думаю, што як-небудзь навучуся... – сказала я няпэўна.

– Табе прыйдзецца выйсьці на наступным скрыжаваньні, таму што я зварочваю ў Ваўкавыск. Посьпехаў табе.

– Посьпехаў, а як жа... – усьміхнулася я і вылезла ў самыя сонечныя прамяні на наступным скрыжаваньні.

* * *

За год да гэтага, пасьля нашых першых счэпак з бацькам, я зьняла пакой у чатырохпакаёвай кватэры. У самым вялікім пакоі жыла маладая сямейная пара. Калі раніцой мы сутыкаліся на кухні, што здаралася вельмі рэдка, таму што найчасьцей я прасыпала першыя пары ў акадэміі, то нам, вядома, даводзілася перакідвацца ветлівымі бессэнсоўнасьцямі, але сузіраліся мы з вельмі яўным *асуджэньнем*. Гэтыя абодва рана кладліся спаць, калі мяне зазвычай яшчэ не было ў хаце, і праз зашклёныя матавым шклом дзьверы з іх пакою ўсю ноч лілося неспакойнае тэлевізійнае сьвятло. Ілона была няўсьмешлівай дзяўчынай з выбеленымі хвалістымі валасамі да плячэй, яна насіла сінтэтычную вопратку з падробнымі цэтлікамі вядомых брэндаў і не ўпускала шанцу зірнуць на мой вечны вэрхал, калі дзьверы ў мой пакой расчыняла скразьняком. Ейны муж, Карлік, да сьліны ў кутках вуснаў даказваў, што яго прозьвішча – гэта памяншальная форма імені “Карл” і сам ён на чвэрць француз. Тым ня менш, Ілона вырашыла не рызыкаваць і крочыла ў шлюб са сваім дзявочым прозьвішчам.

У пакоі нумар два жыў Коля. Ён часта заходзіў да мяне, прыносіў гарбату і мармелад, дыхаў частым гашышовым выпарэньнем у самы нос. Перад прыходам ён заўжды тэлефанаваў мне і ніколі ня грукаў у сьценку, а таксама ня соваўся па ёй шклянкай з надзеяй дазнацца таямніцы аголена-ружовага, зубнапаставасалодкага дзявочага жыцьця. Перад *прыходам* ён заўжды рабіўся трохі маўклівей і загадкавей, чым заўсёды, мог прастойваць пад дзьвярыма з дзясятак хвілінаў і, пакуль час будаваў пясочныя замкі ў маім скрадзеным з школьнай шафы гадзіньніку, ён чакаў і чакаў прыходу, каб пагрукаць ледзьве сьціснутым кулаком і, паставіўшы гарбату на стол, за якім я найчасьцей выпісвала ў доўгія графаманскія санеты свае меладрамы і трагіпрыколы, сесьці на падлогу і ліпка, мядова цягнучы кожнае слова, распавядаць нешта падобнае:

– Прыход – гэта заўжды таямніца пераўтварэньня. Прыход заўжды насоўваецца са сьпіны. Спачатку ўсё змаўкае, потым аднекуль зьнізу хрыбта набліжаецца хваля асалоды. Самы ўдалы прыход – калі забываеш, хто ты. Вось гэта нерэальны каааааайф.

– Што ў цябе сёньня? – цікавілася я.

– Сёньня мне здаецца, што я вадкі. Вадкі і цёплы. Кісеееелісты.

На такіх момантах нас прабірала на рогат, нават, хутчэй, на гогат, хаця, з гледзішча таго, што мы рабілі “га-га-га”, гэта быў гагат. Пасьля Коля даставаў піпетачку, і я пацягвала з шкляной трубкі гарачы пякельны дымок.

– Я памятаю такога аднаго пацана, яго клікалі Вадзім, – распавядаў мне Коля. – Большасьць людзей дзеліцца сваімі сакрэтамі інтымна, тэт-

а-тэтна, з кімсьці адным ці двума, адмыслова з імі дзеля гэтага сабраўшыся, або наадварот, ёсьць людзі, якія галасна і наўпрост выдаюць усе свае прыватныя справы вялікаму колу людзей. А вось Вадзіііім... Ну, дадумайся сама.

– Вадзім ня меў сакрэтаў?

– Халодна.

– Нікому нічога ніколі не расказваў?

– Ну што з табой такое? Не!

– Ооооо, толькі ня гэээта!

– Што?

– Вадзім быў прывідам, чалавекам з *чыйгосьці* сакрэту! Калі пра яго ўзгадвалі, ён нібыта абуджаўся, а потым зьяўляўся ўначы ля ложкаў тых, хто яго называў, і заклейваў ім рот смалой, а затым наліваў сіроп у нос! А пасьля блытаў валасы, як ласка коням па начах! Так?

– Мне падабаецца тое, што ты кажаш, працягвай.

– У кожнага насамрэч ёсьць што сказаць пра Вадзіма. Пытаньне толькі у тым, сказаць ці не.

– Хто ж тады гэты самы Вадзім?

– Вадзім – гэта... гэта Максім. Толькі – тссс...

– Ну вось, ты акурат зараз сказала адзін з яго сакрэтаў! Сёньня чакай Вадзіма ў госьці! – пераможна лямантаваў Коля, пакуль я пачынала зелянець ад страху.

Пасьля, калі нас трохі адпускала, Коля знаёміў мяне з *сапраўднай* гісторыяй:

– На самой справе я хацеў распавесьці табе пра Вадзіма, бо мяне заўсёды зьдзіўляла, як розныя свае сакрэцікі ён шэпча некаму на вушка ў прысутнасьці многіх сяброў і знаёмых. Ён прыходзіў у кампанію і тут жа пачынаў некаму нешта шаптаць, або наогул адводзіў каго-небудзь з самых вясёлых і сьмяшлівых людзей на адлегласьць метру ад усіх і пачынаў прыглушаным голасам нешта мармытаць паўгадзіны, а то і больш.

– Жудасны чалавек, лепш бы ён і сапраўды сіроп у нос заліваў! Зрэшты, хадзем зробім какавы, – казала я і адчыняла дзьверы, каб ісьці ў кухню. Як правіла, прынамсі адзін гузак на лоб тут жа нехта атрымліваў.

– О, прывітаньне! – імітаваў недарэчную зьдзіўленасьць чалавек, які да гэтага стаяў пад дзьвярыма, і тут жа зьвяртаўся да Колі: – Хацеў перапісаць у цябе якога кінца, а ты не ў сябе... Баяўся вам перашкодзіць.

Звычайна гэта быў Карлік. Так-так. Амаль заўсёды гэта быў Карлік. Ён сапраўды хацеў толькі кінца і ніякім чынам не зьбіраўся лезьці ў наш сьвет. Доказам гэтага служыць той факт, што Карлік заўсёды пазьбягаў любых фізічных кантактаў са мной і Колем. Ён заўсёды хаваў рукі за сьпінай і, здавалася, нават стараўся паменш зазіраць у нашыя сьветлыя, засыпаныя рабаціньнем твары.

Аднак пару разоў дзьверы ўсё ж заехалі па дупе яшчэ аднаму кватаранту, пра якога дагэтуль гаворкі ў гэтым сумнеўным аповедзе не вялося.

– Хадзем, зробім какавы, – сказала я і адчыніла дзьверы.

– Я не магу працаваць, не магу спаць, не магу жыць! Але я ня буду падыхаць пры табе, сучка! – крыкнуў хлопец, якому я заехала па заднім

месцы, і толькі пасьля павярнуўся да нас тварам. – Можна, я пераседжу ў цябе, пакуль яна зьбярэ свае анучы?

Сяргей. Сын гаспадара. Невысокі, паўнаваты, займаў самы вялікі пакой, вельмі часта не начаваў дома і ўжо тым больш ніколі не зьяўляўся на нашай камунальнай кухні, каб зазіраць ува ўсе рондлі, пакуль іх гаспадары адлучыліся ад пліты на некалькі хвілінаў.

– Даўно тут жывеш? – спытаў ён мяне, калі я прынесла тры кубкі какавы і паставіла іх на прадаўгаватую драўляную скрыню, якая служыла мне гасьцёвым сталом.

– Месяцы паўтары, – завагалася я. – Не, ужо амаль што два. А ты хіба ніколі мяне тут ня бачыў?

– Шчыра кажучы, мне наогул забаронена блізка знаёміцца з кватарантамі. Мой бацька здае гэтыя пакоі, каб будаваць маёй маці палац за кальцавой. У нас насамрэч некалькі кватэраў. Мой бацька гэтым займаецца. Ён даўно прапаноўваў мне цэлую кватэру. Але гэта нявыгадна. Тут вы ўсё аплочваеце: камунальныя розныя, тэлефон. Крутняк, я ня трачу ні капейкі на жытло. Да таго ж тут усё страшнае, аблезлае, а людзі, якія здымаюць *пакоі*... ім ня трэба рамонту. Ніякіх укладаньняў з боку фірмы. Пасьпяховая задума, праўда?

– Эээ... – працэдзіў Коля і рэзка ўстаў. – Клёва, клёва. Ну, прыемна вам пасядзець, а мне час бегчы.

Калі ён выйшаў, я ўспомніла, што яму няма чым заплаціць за гэты месяц.

– Ты сустракаешся з гэтым пацаном? – запытаўся Сяргей і, не дачэкваючыся майго адмаўленьня, адразу ж пачаў хутка тараторыць, наслойваючы слова на слова: яна мяне праўда закалупала. Ёй усё не падабаецца. Яна хоча заехаць у лепшы флэт, які будзе толькі для нас дваіх, і ёй зусім накласьці, што гэта пацягне за сабой цэлы шлейф праблемаў. За пару гадоў яна цалкам зжылася з думкай, што рана ці позна стане маёй жонкай, але пры гэтым яна ўжо зусім развучылася хадзіць пешкі, яе трэба везьці на колах ад дзьвярэй да дзьвярэй, яна ня ўмее гатаваць і таксама вельмі прывыкла харчавацца толькі ў рэстарацыях, а яшчэ яна перастала сачыць за сабой, у яе жывот расьпёрла і бакі, а задніца стала як жэле, як амлет! Яна адвыкла ад людзей, стала зашмат снабіць, для яе цяпер якая-небудзь афіцыянтка ў рэсьціку – гэта ніжэйшая раса...

– Ну, можа быць, ты таксама ў гэтым троху вінаваты, – асьцярожна прамовіла я.

– Я працую, як конь, стамляюся, як сабака! – зарычэў Сяргей. – У мяне няма больш сілаў: купі-прадай, складзі-адымі, набяры-раскідай – і гэтак штодзень! Я ня буду, *ясная справа*, казаць табе, чым я займаюся, але, павер мне, я стамляюся. А яна, яна ўжо затрахала мяне сваімі кабакамі, казіно, караоке, каратэ, кабарэ... Ка... Калісьці я хацеў цярпець гэта, але цяпер зразумеў, што ня мушу. Я хачу іншую дзеўку, шмат новых баб! Ну ты мяне, як мужыка, разумееш...

– А як жа каханьне? – сказала я флегматычна і паціху пачала ненавязьліва жадаць, каб ён хутчэй зьліняў. Адначасова з некаторым раздражненьнем у мяне пачаў балець зуб.

– Каханьне можа быць толькі з першага погляду. Калі глядзіш – і адразу хочаш. А потым атрымліваеш – і што далей з гэтым скарбам рабіць, незразумела, ён толькі перашкаджае табе рухацца да сукцэсу. Вось ты,

напрыклад. Каб угледзець, што ты сімпатычная, трэба добра папрыглядацца. Папрыглядаешся – дык ты нават прыгожая. Але я не падышоў бы да цябе на дыскатэцы...

– Я не хаджу ў дыскатэку, – сумавала я, мнучы пальцамі сваю шчаку, за якой разныўся мой няшчасны зуб.

– Ды ты наогул з антэнкамі ў галаве! – сказаў Сяргей з пяшчотай старэйшай сястры. – У цябе погляд вар'яткі. Ты часам не лесьбіянка?

– Хочаш сказаць, каханьня не існуе? – ляніва працягвала я, жадаючы, каб мой суразмоўца нарэшце перастаў нешта *хацець сказаць*.

– Каханьне перашкаджае сукцэсу. Вось і выбірай: рэгулярная цёлка ці сукцэс у ва ўсім астатнім...

– Сукцэс? – сказала я і пакрывілася.

– Мадамачка! – крыкнуў Сяргей. – Success – гэта посьпех, сячэш?

Я выпіла пігулку ад зубнога болю, і, як пабочны эфект, у мяне разбалелася галава.

* * *

Вільня аказалася стрыечнай цёткай, якая ўсё тваё жыцьцё пражыла дзе-небудзь на Захадзе. У нас з ёй былі аднолькавыя рысы твару: той жа бульбісты беларускі нос, тыя ж зморшчынкі каля вуснаў. Яна гэтак жа жартавала і плакала горкімі сьлязьмі, разам з тым, гэта быў чужы чалавек, звыклы да іншага ладу жыцьця, ён размаўляў на шматлікіх мовах, з якіх паловы я ня толькі не разумела, але нават не пазнавала на слых. Калі мы пазнаёміліся, я шукала ў ёй Беларусі, і Беларусі было ў ёй энцыклапедычна шмат, калі я праходзіла па крывых вуліцах, над імі адразу ж усплывалі даты, імёны і выпіскі з пажоўклых архіўных кніг. Над некаторымі дамамі віселі кругленькія чатырохзначныя лічбы, над некаторымі да іх дадаваліся партрэты ўсіх тых герояў школьнага падручніка па гісторыі. За кожным паваротам можна было натыкнуцца на вершаваныя і ня вельмі радкі, выпісаныя з анталогіі беларускай літаратуры. Вільню я ад першага дня бачыла, як гэтакі фотаальбом з каментарамі. Спачатку я пабойвалася яе: свабодная і свавольная, яна была, нібы мора, у яе быў складаны характар, і яна нема слухала ўсе мае воклічы, пакідаючы іх распушчацца ў сваёй начной вясковай цішы. Я таптала бручок, дазваляючы стогадовым камяням сьціраць падэшвы маіх чарговых сандаляў. Я любіла яе і баялася. Я любіла і баялася Лютаўраса. Гэтага хлопчыка я сустрэла ў Віленскай кавярні, калі пенка ад латэ вывальвалася з лыжачкі мне ў рот.

– Лабас, – сказаў Лютаўрас, і, абвёўшы рукой невялікае памяшканьне, відавочна, гэтым указваючы на адсутнасьць свабодных месцаў, узяў мяне на рукі і перасадзіў на суседняе крэсла, а сам тут жа ўсеўся побач і паглыбіўся ў меню. Пасьля ён зазірнуў да мяне ў кубак, памачыў у каве палец, пакаштаваў пенку, і, калі падышла дзяўчына, замовіў яшчэ два гэткія ж кубкі. Калі каву прынесьлі, ён паставіў адную каля мяне, а сваю адставіў убок, дастаў вялізную газету, і загарнуўшыся ў яе, цалкам *аддаўся* чытву. Я неспакойна заёрзала, разумеючы, што, магчыма, мая персона была для яго толькі яшчэ адной з матэрыяльных перашкодаў. Падобна на тое, што я не памылілася. Дапіўшы каву, ён разьлічыўся, згарнуў газету і выйшаў.

Я ўстала і пакрочыла за ім. Паколькі ўласная настойлівасьць і раз-

дражненьне не дазвалялі мне пакінуць гэты дзівацкі занятак, мне нічога не заставалася, як спрабаваць не адставаць ад яго, паміж тым разглядаючы сьпіну, ногі, зад, дасьледуючы хаду майго незвычайнага суседа па кавярным століку. Усё гэта, узятае разам, апынулася дастаткова прывабным і надзвычай мужчынскім. Крочыў ён бадзёра і, занырнуўшы ў арку, зайшоў у прыватную мастацкую галерэю, якіх процьма ў гэтым горадзе. Я моцна запыхалася, паколькі гэты чалавек хадзіў вельмі хутка, і часта кружляў, мяняючы накірунак свайго шляху.

У галерэі, пакуль ён піў каву ў кампаніі пульхнай уладальніцы з пафарбаванымі ў белы колер валасамі і яе тоненькай маладой асістэнткі, я хавалася за карцінамі і спасьцігала новыя прынцыпы і эстэтыку сучаснага мастацтва, не перастаючы пры гэтым назіраць за маім суседам з-за сьценак, праз тоўстае шкло і пустыя рамкі. Калі ён выйшаў, я, як нескладана здагадацца, пайшла за ім. Сучаснае мастацтва цікавае і каляровае. Яно куды больш сьмелае і дасканалае, чым класіка. Але ў ім няма таго непаўторнага і чароўнага, што магло б засмактаць мяне проста там, у галерэі, спыніць, прыклеіць і перакуліць мой сьвет дагары нагамі. Па сутнасьці, сучаснае грамадства і не патрабуе таго, каб нехта пераварочваў сьвет. Уся творчасьць накіраваная на зьдзіўленьне, ураджаньне, захапленьне – але толькі не на рэвалюцыю ў галаве. Рэвалюцыя ў галаве можа парушыць канструкцыю, можа сарваць дах, можа адмовіць посьпех, а гэта быў бы бясспрэчны канец. Вядома, за ім бы непарыўна ўзьнікла новае, толькі навошта лезьці туды, дзе з першага разу заведама ня станеш пераможцам.

За той дзень мы (хаця адная я ведала, што нас – двое) зайшлі ў самыя розныя месцы. Мы па чарзе перагарталі адныя і тыя ж кнігі ў кнігарнях, потым памачылі ногі ў Вілейцы, назіраючы дзетак, якія галышом скакалі ў вадзіцы, падстаўляючы небу і польскім турыстам свае малочна-жоўтыя цельцы. Потым мы зайшлі ў Францысканскі касьцёл, і прабылі там каля гадзіны. Я не магла дазволіць сабе задумацца, зьвярнуцца да вышэйшых з малітвай, ці хаця б памарыць, таму што мне патрэбна было пільнаваць Лютаўраса, які зайшоў сюды, відавочна, каб выканаць нейкую адказную духоўную місію. Ён застываў нерухома, выцягваўся так, што, здавалася, яго хрыбетнік павінен быў зьвінець, як напяты лук. Не мяняючы пазіцыі, ён адседжваў так некаторы час, а потым рэзка ўставаў, праходзіўся паміж шэрагаў лаваў, на якіх толькі дзе-нідзе сядзелі самотныя людзі, унурыўшы пагляд у сваё глыбокае "ўнутры". Прайшоўшыся, ён ізноў дзесьці спыняўся, сядаў і *замарожваўся* на які дзясятак хвілінаў. Я совалася туды-сюды па касьцёле, удаючы якую-небудзь польскую турыстку, упэўненую ў тым, што „Wilno nasze", а ейная роля турысткі тут недаўгавечная. Раптоўна дзьверы ў касьцёл рэзка, акурат вельмі па-турысцку, рыпнулі, і касьцёл, як якая навалач, навадзнілі амерыканцы. Амерыканцы – і тут я не зраблю адкрыцьця – пазнаюцца па зубах. Ня тое, каб зубы ў іх былі велічэзнымі – проста іх неяк аж завельмі *шмат*. Я стаяла збоку, а вакол мяне клацалі амерыканскія зубы, скрыгацелі амерыканскія зубы, плавалі, ірдзеліся, перламутрыліся, перашэптваліся, пераміргваліся парцалянавыя амерыканскія зубы на рабых і пажоўклых тварах амерыканскіх старэнькіх. Зубы акружылі мяне, круцілі вакол мяне карагод, перасыпаліся калейдаскопнай мазаікай. Калі я ўрэшце вычухалася з гэтага гіпнозу і выбегла на двор, Лютаўраса ані-

дзе не было. Я трохі пачакала і, пашкадаваўшы пра бясплённа праведзены дзень ды ўваткнуўшы ў вушы затычкі з цёплымі хітамі амерыканскіх 40-х, нясьпешна папаўзла слаба асьветленай дарогай. Мне пачало само сабой узгадвацца дзяцінства. Лічыцца, што тады кожны быў шчасьлівым. Дзіцячае шчасьце, нібыта, у няведаньні і шматлікіх таямніцах спазнаваньня. З успамінаў маленства не складзеш меладраматычны сюжэт з мінорным бэкграўндам, таму што карцінкі ўсе сьветлыя і ясныя, чыстыя, шматколерныя: недахоп грошай ні на што не ўплывае, бабуля яшчэ ня хворая, мама яшчэ гатуе тату боршч, марозіва халаднейшае і саладзейшае, чым цяпер, і можна схавацца ў той траве, якая сёньня можа хіба што сьцягно паказытаць.

Са свайго ж дзяцінства, вось бяда, я магу прыгадаць толькі самыя дзівацкія і недарэчныя моманты. Я ўспамінаю, як мяне прыводзілі на госьці да якіх-небудзь нашых сваякоў у простую і страшную саўковую хрушчоўку са шпалерамі ў ружыкветку, наскрозь прапахлымі ўсімі сьнянданкамі і вячэрамі, прыгатаванымі і спажытымі за дваццацігадовы перыяд часу. Ніхто не тлумачыў мне, што да чаго, і адкуль сьвежая лекаранная бель у нашым прасторным жытле. Я бачыла засаленыя варэнныя, расколатую фарбу на падлозе, кепска ўбраных сваіх цётак, дзядзькоў і іх дзяцей, якія рэзаліся ў прыстаўку перад тэлевізарам, у той час як мне былі забароненыя ўсе гульні, а адзінымі вартымі прагляду тэлевізійнымі відовішчамі лічыліся навукова-папулярныя праграмы і кіно без нецнатлівых сцэнаў. Непрыемнасьць такога ўспаміну ня ў тым, што тады я адчувала зайздрасьць, груба перамяшаную з грэблівасьцю, а, хутчэй, у тым, што з гэтых момантаў у маёй сьвядомасьці пачало стала і ўпэўнена сьпяліцца і гадавацца пачуцьцё глыбокай чорнай прорвы, якая аддзяляе мяне ад *сьвету нармалёвых*. Маса жудасьнейшых дзіцячых карцінак затрымлівае мяне каля маіх дробных тагачасных аднагодкаў, якія паглынаюць камунарку і ліманад, стаяць у першых чэргах у першыя макдональдсы, трымаючы маму за крысо палітона потнай ад прадчуваньня хуткага гамбургера рукой. Сьвет, на які я глядзела быццам праз шкло, таксама не адгукаўся добразычлівасьцю. Выразна памятаю, як кучаравы Цімафей з майго двара аднойчы падбег да нашай машыны, у якой я дачэквалася бацьку, і, не адрываючы злоснага пагляду ад мяне, зжэр дажджавога чарвяка, якога толькі што падняў з зямлі. Непрыемнасьць гэтае сітуацыі палягае ў тым, што я таксама не магла адарваць ад яго пагляду, зачараваная гэтым раптоўным выбухам брутальнага хлапечага пратэсту, які сам *Mr Выпадак* ажыцьцявіў па той бок шкла ад мяне. З такіх вось момантаў з цягам часу вырасла мая звычка *няёмчыцца* за ўсё і ўсіх на сьвеце. Напрыклад, мне ўспамінаецца незнаёмая кабета, стоячы побач з якой, я аднойчы ехала ў тралейбусе да сваёй аднакласьніцы. У гэтай цёткі ўвесь час званіў мабільны тэлефон, і яна крычала на ўвесь салон пра “пастаўкі”, “дагаварныя цэны” і “этат тавар ідзёт как распрадажа”. Лямантавала яна настолькі гучна, што ўсе без выключэньня глядзелі на яе з абурэньнем на падкрэсьлена нямых тварах. Я таксама пазірала, толькі мяне зьядалі сполах і сорам. Я жудасна няёмчылася праз гэтую крыклівую незнаёмую мне кабеціну.

Наогул мне ўжо з дзяцінства можна было рабіцца скарбніцай сусьветнага сораму. Шкада, што гэта так і не прыйшло мне ў галаву.

– Сочыш за мной? – Лютаўрас прыпёр мяне да сьцяны прыдарож-

нага будынка, балюча схапіўшы абедзьвюма рукамі за шыю. – Нехта цябе намовіў за мной паляваць?

Я піснула і ў гневе піхнула яго рукамі ў жывот.

– Позна, перадумала ўжо, – сказала я, калі ён прыбраў ад мяне свае рукі.

– А чаго ты за мной падглядала, можна даведацца? – запытаў ён ужо без агрэсіі.

Калі я коратка патлумачыла яму сэнс свайго дэтэктыўства, ён зусім супакоіўся, заўсьміхаўся і запрасіў мяне на гарбату.

– Дома толькі я і сястра, – сказаў ён. – Таму можаш наогул патусавацца ў мяне, нават пераначаваць, Міс Марпл. Дарэчы, мяне завуць Лютаўрас.

* * *

Дома ў Лютаўраса сапраўды быў толькі сам Лютас і яго малодшая сястра. Малая, якую ўсе навокал клікалі Пеле (ня ў гонар вялікага футбаліста, а з банальнага падабенства паводзінамі ды норавам да мышы, бо менавіта іменем вялікага футбаліста на Летуве завецца малая шэрапоўсная жывёла), была студэнткай філалогіі адной з найжывейшых моваў. Калі мы прыйшлі, яна дамывала посуд, выпусьціўшы на волю пах мыйных сродкаў, што далятаў ажно да засіканага суседзямі-коцікамі ліфту.

– Гэй, Пеле, ты што тут робіш? – запытаў мой новы знаёмы, а сястрына сьпіна выгнулася, як сабака ад голасу гаспадара, што неаднаразова мясіў яго палкай па хрыбце.

– Я ўжо звальваю, – адказала дзяўчына (разглядаючы ейны спалоханы дзіцячы профіль, я магла толькі здагадвацца пра ўсе тыя факты сарамлівага дзявочага ананізму, якія замянялі гэтай малой немагчымыя факты вясёлых сексуальных прыгодаў).

– Дык чаго ты чакаеш? Калі б ты зьбіралася зьліняць, зрабіла б гэта, толькі пачуўшы, як мой ключ пазбаўляе нявіннасьці дзьвярную шчыліну! – голас Лютаўраса стаў страшэнным, нездаровым, ён узарваўся выбухам, і Пеле, напэўна, даўно прызвычаеная да гэтай безапеляцыйнай вайны, прысохла да месца, дзе стаяла, апусьціўшы пенныя рукі долу, а вада з белымі бурбалкамі палілася на зямлю, утвараючы living рознаколерныя бензінавыя плямкі на лінолеўме. – Гэтая шчыліна даўно жыве поўнае жыцьцё, куды паўнейшае за тваё! Ты што – маць Марыя, чакаеш пакуль Бог удыхне ў цябе немаўля?! Пакуль ты травішся сваімі слоўнікамі і маўчыш – ах, як яна маўчыць, яна можа прамаўчаць стагоддзі! – думаеш, я ня бачу, як ты смокчаш маё жыцьцё? Як ты ясі яго сваім ніколі не цалаваным іртом? Думаеш, я ня чую твайго жарснага дыханьня за сьцяной, калі я распранаю сваіх кабет? Часовых, выпадковых, сьлізкіх агідных жанчын, такіх, да якіх, тым ня менш, урэшце ўцячэ і той самы сьлімак, які набярэцца цярпеньня і мужнасьці зьдзерці з цябе гэтую шалёсткую абгортку, намёртва прысохлую да скуры! Дура!

Такой пакоры я ня бачыла аніколі. Яна села на падлогу і, уваткнуўшы пагляд у кухонны кут, цярпела і чакала, пакуль ейны ашызелы старэйшы брат, закусіўшы язык зубамі, паглынаў ейную скукожаную істоту вачамі, поўнымі нянавісьці і моцнага душэўнага непакою.

Калі ўрэшце Лютас павярнуў галаву ў мой бок, і з твару яго зьніклі ўсе адзнакі вар'яцтва, Пеле ціхенька выкараскалася з-пад яго пагрозьліва навіслага над ёй цела, і, узяўшы са стала шклянку, падышла з ёй да лядоўні. Лютаўрас, раптоўна суцішаны, цёпла і любоўна назіраў за мной, а я корчыла яму ўсьмешлівыя твары і працягвала сачыць за Мышкай. Яна дастала пачак малака і пачала павольна напаўняць шклянку. Злавіўшы мой позірк, Лютас ізноў паглядзеў на яе.

– Што ты робіш? – зарычэў ён і кінуўся на яе. – У тваім узросьце малако – атрута!

Падскочыўшы да сястры, ён вырваў шклянку і ляснуў яе ад падлогу. Малако цёпла і падатліва распаўзлося ў даўгую бесхрыбетную істоту. Пеле, якісьцінная мыш, імгненна і бясшумна шмыгнула ў калідор.

– Пакажы мне, дзе мой ложак, – асьцярожна папрасіла я. – Гэты дзень змарыў мяне зусім, хочацца паспаць.

Ён адвёў мяне ў бацькоўскі пакой і адразу зьнік, зачыніўшы дзьверы за сабой.

Я засталася адна і ўзяла ролю акушэркі ў разраджэньні свайго вялікага заўсёды цяжарнага пляцака. Я дастала з яго мяккіх плямістых нетраў свае доўгія швэдры і піжамы й з-пад ахайных капэртаў вопраткі, укладзенай паводле нескладанай падарожніцкай навукі прастораваай эканоміі, знайшла свой некалькігігабайтавы ай-под, на векі вечныя верны ўсёй запісанай на яго аднойчы музыцы, паколькі адразу пасьля першага парушэньня яго цноты мой маленькі хрышчоны брацік Пранік выкалупаў яму жалезныя usb-вусны. Мяне ніколі не злавала непарушнасьць гукавага зьмесьціва майго прайгравальніка, паколькі любоў да пэўнай музыкі выпрацоўваецца ў мяне адначасова з некаторай *млосьцю* ад яе бесперапыннага засільля. І цяпер такім чынам я засталася назаўжды спалучаная з тымі дваццацьцю альбомамі, ніводзін з якіх ужо праз нейкі час ня быў выпадковым у маім жыцьці. Пад сьмешныя нірванічныя спробы нашых юных сталічных *блазнаў* я ня раз сьпяшалася на сустрэчы ля пераможнага ледзянца, пост-панкавыя дэманы з прыгажэйшых за маю краінаў дзерлі мне сэрца ў час балючых куртуазных расчараваньняў, тэчку з трып-хопам я адчыняла заўсёды, калі пераставала хапаць сваёй уласнай, не прыглушанай чужым энергетычным потам свабоды. І зараз я, як і сотні разоў раней, адчыніла гэты апошні прыстанак перад тым, як моцна раззлавацца, і пачала па чарзе даставаць усе тыя чароўныя масіўныя атакі і ўкручваць іх у вушныя чарупіны. Супакоіўшыся і ледзь заўважна прасьлязіўшыся, я зноў паглыбілася ў эксгумацыю майго заплечнага чэрапа і знайшла тую касьметычную частку шэрага рэчыва, якая адказвае за наданьне рысам твару ўпэненых сакавітых барваў. Пагойдваючыся ў родных, як мама, электронных гуках, я назірала свой сьмешны недарослы твар у люстэрку і выводзіла на ім вішнёвыя вусны, якія рабілі мяне яшчэ сьмяшней і *недаросьлей*. У нейкі моман я ізноў адчула, што хтосьці адчайна руйнуе маю салодкую дзявочую самоту, прагрызаючы ўва мне дзірку сваімі галоднымі вачыма.

– Навошта ты фарбуеш вусны перад сном? – зьдзівіўся Лютаўрас.

– А ў мяне там раман... – паспрабавала вытлумачыць я і тут жа зразумела, што гэта гучыць у найлепшым выпадку дзіўна і неразумна.

– Штооо? – зморшчыўся Лютас. – Дзе – там?

– Ужо некалькі месяцаў я сустракаюся з хлопцам са свайго сну. Сёньня дамовіліся ісьці на канцэрт у летні амфітэатр.

– З хлопцам са свайго сну? – паўтарыў за мной мой сьвежы віленскі знаёмы і камічна скрывіўся. – У цябе ўсё ў парадку з галавой? Можа, ты выдумляеш? Ня можа сьніцца месяц запар адзін і той жа чалавек!

– Ён не заўсёды сьніцца мне аднолькавым. Найчасьцей ён наогул – проста ўражаньне, што гэта ён. Я б не змагла яго, напэўна, намаляваць, калі б мне далі аловак і аркуш паперы адразу пасьля сну, раніцой.

– А калі б ты яго сустрэла ў жыцьці, зразумела б, што гэта – той самы, са сну?

– Так, безумоўна. Толькі мне падаецца, што яго папросту няма. Ён толькі сьніцца і ўсё.

– І што менавіта табе сьніцца? – па-мойму, Лютаўрас сур'ёзна зацікавіўся тым, што адбываецца ў маім падсьвядомым асабістым жыцьці, нават перастаў скептычна крывіцца.

– Спачатку мне сьнілася ўсё тое ж, што адразу адбывалася. Напрыклад, сьніцца, што я сяджу на Бабруйскай крэпасьці, п'ю агідны джынтонік з пластыкавай бутэлькі, а рукі мае ўсе ў крыві, а ўжо праз тыдзень сапраўды мы з сябрамі заязджаем у Бабруйск на фестываль, а потым я падаю з лесьвіцы ў крэпасьці і абдзіраю сабе абедзьве рукі да локцяў... Ну і такія дробязі розныя сьніліся. А потым аднойчы пачало сьніцца зусім іншае месца, мора, пяскі, сосны, цішыня. Там мы і пазнаёміліся. Спачатку гулялі, нават не размаўлялі ні пра што, і так усё было ясна. Пасьля пачалі знаёміцца, хадзілі на мора і ратавалі мядуз перад халоднымі часамі, лавілі іх і заносілі дадому, у акварыум. Восеньню яны так ці інакш памруць, будуць пасьля ляжаць на беразе мора, мёртвыя амлецікі...

– Мора? Ты што – Палангу сьніш?

– Не, я сьню касу. Толькі я там ніколі не была.

– Дык ты туды едзеш? Во рамантык! Думаеш, што сон спраўдзіцца? Але сны ня спраўджваюцца, бо яны – у тваёй галаве! Ты ня можаш прыдумаць чалавека, а пасьля яго яшчэ й сустрэць, бо ты яго сама прыдумляеш, ясна табе? – пракрычаў Лютаўрас і засьмяяўся.

– Ды ня еду я нікуды... – раптам я моцна пашкадавала, што распавяла нешта такое, што і так крохкае і эфемернае, і так усяго гэтага лічы няма... А цяпер віленскі хлопец Лютаўрас, пра якога я ведаю толькі тое, што ў яго бываюць прыступы жорсткасьці, а часам ён дзівачыцца, як фрык з кінафільму, цяпер гэты чалавек будзе ведаць, што я яшчэ менш вартая павагі і даверу, чым была да таго.

– Э, ты чаго? Ну каці сабе на сваю касу, хто ж табе забараняе?

– Давай ты забудзешся пра тое, што я табе распавяла, – прапанавала я.

– Ну прабач, я ня ўмею разумець такіх дурнотаў, у мяне мазгі заварочваюцца, як кішкі, – сказаў Лютаўрас і рэзка падняўся з крэсла. – Дабранач, мілая, салодкіх табе сноў, ці я ўжо і ня ведаю *чаго* табе трэба жадаць на ноч.

– Дабранач, табе таксама, – пажадала я дзьвярам, якія, скрыпнуўшы, зачыніліся.

Калі я патушыла сьвятло і пачала засынаць, дзьверы раптоўна скрыпнулі зноў, і ў шчыліну прасунулася галава Лютаўраса:

– А гэты – каторы табе сьніцца – можа ж быць, што гэта я?

Я дакладна ведала, што дакладна ня можа быць, што той самы, каторы мне сьніцца, – гэта ён. Той, каторы сьніўся, жыў на касе. Зрэшты, у яго былі і іншыя асаблівыя прыкметы.

* * *

На пароме вецер цягнуў мае валасы ў танец еднасьці з поўнымі, набрынялымі рыбным тлушчам кірлямі. Кірлі? – спытаеце вы. Кірлі – гэта чайкі, чорт яго ведае, адкуль узялося гэтае слова, але яно такое непадробна прыгожае. Кірлі, вялікія і цяжкія, бязважка, як касманаўты, завісалі ў паветры, не рэагуючы на паветраную інерцыю, і чакалі, відавочна, калі нехта з пасажыраў, разгубіўшыся і страціўшы ўнутраны аўтапілот,ываліцца за борт, умомант засьведчыўшы сваю мясную, саладкаватую чалавечую спажыўнасьць. Але падарожжа ад берагу да касы караткае, толькі і пасьпяваеш, што разгледзець пару расейскіх караблёў з гучнымі царскімі імёнамі, навязаных, як гіганцкія сабакі, з воднага надворку клайпедскага порту, калі паром паркуецца пры беразе дзікім, жоўтую пяшчаную поўсьць якога пакрываюць леапардавыя плямы заклятых чорных пяскоў. І тут ужо не да згадак пра тое, што ты забыўся па той бок разьлітага Нёману (прас згарыць разам з кватэрай, твой пасаг прап'юць малодшыя браты, а словы, на якія так і не хапіла мужнасьці, палягуць у свае адмысловыя нелітаральныя магілы), тут сканчаецца гісторыя і вось-вось скончацца мае доўгія ўцёкі ад чужога посьпеху.

Я сышла з карабля, і сукенка скруцілася коткай ля ног, а поўсьць на маёй сьпіне ўздыбілася ў абарончую пазіцыю. Я разулася і далей ужо ішла босая, хаця да пяскоў былі яшчэ кіламетры асфальтаў, сасновых іголак і іншых небясьпечных для мяккіх ружовых ступачкоў фактураў. Гадзіна набліжалася шарая – тая самая, калі цябе накрывае нейкае асаблівае буйназярністае паветра і ўсе колеры навакольля расчапляюць свае сплеценыя паміжсобку пальцы і гучаць цяпер ужо паасобна, яскрава, моцна і непрыхавана. На маршрутнай таксоўцы, у якой апроч мяне сядзеў толькі мясцовы вудаль з *абгладжанымі* вятрамі шчокамі і засаленымі рукамі ды адпачынковая дзяўчынка з каляровай кайстрай, я даехала да мястэчка Юодкранце, якое б турысты ўразператварылі ў лунапарк з вясёлкавым суквецьцем поп-корнаў, калі б падсьвядома не баяліся гэтай касы, як першай споведзі перад бацюшкам з вільготнымі вачамі. У мяне была інакшая падсьвядомасьць – я выйшла ля гары ведзьмаў, як намагнетызаваная, як удзельнік дзетсадаўскай гульні ў цёпла-халодна, які адчуў «цёпла» і ледзь-ледзь – пах сунічнай жуйкі, узнагароды, суперпрызу. Змрок ціха і ветліва сьціскаў мяне ў сваіх абдымках, і я адчувала, падымаючыся ўверх, што больш ніколі адтуль не спушчуся. Там, наверсе, можа быць маланка, якая спаліць мяне разам з самай стройнай хваінай, прызёркай хвойнага дэфіле, а можа ўскіпяціцца мора і падыме такі шторм, што мяне накрые халоднымі бурбалкамі разам з гэтым тоненькім лапікам зямлі. Можа, там мяне чакае маньяк з пажаднай усьмешкай, які пацягне мяне за пшанічныя валасы, каб схапіць за плечы, каб выдзерці і зьесьці сэрца. Там, наверсе, можа быць, вышэй за сосны і галоўны маяк, мяне чакае той самы чалавек, якога я адразу пазнаю між ценяў і шэптаў, які сатрэ *дурацкую* вішнёвую памаду, зьдзярэ сьмешную залатую спадніцу і назаўсёды запляце мяне ружай у гэтую доўгую і няшчадную сонную жоўтую касу.